# УВОДЗІНЫ

Рэшткі Быхаўскай крэпасці, якія складаюцца з замка, земляных абарончых збудаванняў вакол яго і гістарычнай часткі горада, уяўляюць сабой унікальны помнік палацава-замкавай архітэктуры канца XVI – XVIII стст. Сёння гэта адзіны ў Беларусі адносна захаваны горад-крэпасць узору XVII ст. Акрамя таго, гэта прыватны горад-крэпасць. Прыватныя крэпасці, якія належалі магнацкім родам, былі важным элементам абароны Вялікага Княства Літоўскага (далей — ВКЛ) і Рэчы Паспалітай. Гэтыя гарады мелі свае гарнізоны, артылерыю і арсенал. Уладкаванне і арганізацыя гарадоў-крэпасцей былі прыстасаваны для абароны. Нават размяшчэнне жылых кварталаў служыла патрэбам вайны: іх планіроўка дазваляла весці паспяховыя баі і пасля прарыву ворага праз знешнія ўмацаванні.

Старабыхаўская фартэцыя ўвайшла ў гісторыю, галоўным чынам, дзякуючы сваёй важнай ролі ў абарончых баях падчас вайны Рэчы Паспалітай з Рускім царствам 1654–1667 гг. Менавіта ў гэты час Стары Быхаў стаў прыкладам паспяховай рэалізацыі канцэпцыі ідэальнага горада-крэпасці.

У прадстаўленай працы разглядаецца архітэктура, этапы будаўніцтва, арганізацыя абароны і ваенная гісторыя Старабыхаўскай крэпасці выключна XVII ст. Выбар зроблены аўтарамі не выпадкова. Менавіта ў гэтым стагоддзі ў Старым Быхаве была пабудавана бастыённая сістэма ўмацаванняў і забяспечана на найвышэйшым узроўні арганізацыя яе абароны. Менавіта ў гэтым жа стагоддзі настаў час выпрабавання як для крэпасці, так і для яе гераічных абаронцаў. І, на жаль, падзенне крэпасці ў другой палове XVII ст. і жахлівыя страты, панесеныя жыхарамі горада падчас баёў, абумовілі яе далейшы заняпад. Вядома, можна ўспомніць аблогі Старога Быхава падчас Хатняй вайны ў Рэчы Паспалітай (1702 г.) і Паўночнай вайны (1707 г.). Аднак характар гэтых войнаў і мэты, якія ставілі вайскаводцы пры аблогах і абароне крэпасці, а таксама паводзіны жыхароў горада вельмі адрозніваюцца ад таго, што мела месца некалькі дзесяцігоддзяў раней. Такім чынам, Стары Быхаў можна параўнаць са знічкай, якая ярка ўспыхнула на цёмным небасхіле XVII ст., прарэзала дымы ад ваенных пажарышчаў таго стагоддзя і згасла, пакінуўшы на небе свой яскравы след. Можна гаварыць аб тым, што для гэтага горада цесная ўзаемасувязь з узброенымі сіламі з’яўляецца як шчасцем, так і праклёнам. Менавіта развіццё ў Старым Быхаве вайсковай справы і наяўнасць ваенных гарнізонаў абумоўлівалі як яго рост і развіццё, так і заняпад. Так было і ў XVII, і ў XX стст.

Дадзеная праца складаецца з трох раздзелаў. У першым раздзеле «Быхаў у першай палове XVII ст.», падрыхтаваным М. Волкавым, паведамляецца пра этапы будаўніцтва замка і фартыфікацыйных збудаванняў, аналізуюцца перадумовы і прычыны росквіту Быхава. Таксама аўтар разглядае некаторыя пытанні, звязаныя з гісторыяй быхаўскай людвісарні і гарнізона фартэцыі. Другі раздзел «Старабыхаўская крэпасць у XVII ст.: архітэктура і арганізацыя

абароны» за аўтарствам Р. Галынскага і Ю. Шкаплярова прысвечаны апісанню ўладкавання і арганізацыі абароны Старабыхаўскай фартэцыі ў XVII ст. У трэцім раздзеле «Горад-герой XVII ст.: Стары Быхаў у вайне Рэчы Паспалітай з Рускім царствам 1654–1667 гг.» падрабязна разглядаюцца ваенныя дзеянні і падзеі вакол Старога Быхава падчас згаданай вайны. Аўтарам апошняга раздзела з'яўляецца Ю. Шкапляроў.

Кніга адрасуецца шырокаму колу чытачоў, перш за ўсё тым, хто цікавіцца ваеннай гісторыяй Беларусі ўвогуле і гісторыяй Быхава ў прыватнасці.